КОНТРОЛЬНЫЙ
ЭКЗЕМПЛЯР

Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка»

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Прарэктар па вучэбнай рабоце БДПУ
__________ У.У.Шлыкаў
«01» 06 2017 г.
Рэгістрацыйны № УД-30-01-39-2017/вуч.

# НАРОДНАЯ ПЕДАГОГІКА

Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі
па вучэбнай дысцыпліне (па выбары)
для другой ступені вышэйшай адукацыі (магістратуры)
па спецыяльнасці:
1-08 80 02 – Тэорыя і методыка навучання і выхавання
(сусветная і айчынная культура)

2017 г.

Вучэбная праграма складзена на аснове адукацыйнага стандарта вышэйшай адукацыі АСВА 1-08 80 02-2012 па спецыяльнасці 1-08 80 02 – Тэорыя і методыка навучання і выхавання (сусветная і айчынная культура), № 108 ад ад 24.08.2012 г.

СКЛАДАЛЬНІК:
Н.Г. Мазурына, дацэнт кафедры тэорыі і методыкі выкладання мастацтва ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка", кандыдат філалагічных навук, дацэнт

РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:
Кафедрай тэорыі і методыкі выкладання мастацтва
(пратакол № 10 ад 12.05.2017 г.);
Загадчык кафедры Н.В.Бычкова

Саветам факультэта эстэтычнага выхавання
(пратакол №10 ад 22.05.2017 г.)
Нам. дэкана па вучэбнай рабоце Т.В.Сярнова

Афармленне вучэбнай праграмы і суправаджаючых яе матэрыялаў дзеючым патрабаванням Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь адпавядае

Метадыст вучэбна-метадычнага
управлення БДПУ
_______________ Т.В. Шчыпунова

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне “Народная педагогіка” (па выбары) распрацавана ў адпаведнасці з патрабаваннямі адукацыйнага стандарта па спецыяльнасці для другой ступені вышэйшай адукацыі (магістратуры) 1-08 80 02 – Тэорыя і методыка навучання і выхавання (сусветная і айчынная культура).

“Народная педагогіка” – інтэграваная вучэбная дысцыпліна, якая знаёміць студэнтаў з сістэмай народных педагагічных сродкаў вырашэння выхаваўчых, развіццёвых і адукацыйных задач этнасу. Яна непасрэдна звязана з фалькларыстыкай, этналогіяй, педагогікай, гісторыяй сусветнай культуры, гісторыяй беларускай культуры, мастацкай культурай Беларусі.

Вывучэнне вучэбнай дысцыпліны “Народная педагогіка” ” (па выбары) накіравана на ўсведамленне студэнтамі традыцыйнай педагагічнай спадчыны народа як высокаарганізаванай сістэмы. Яе фарміруюць традыцыйныя веды і працоўныя навыкі ў сямейнай і нацыянальнай этыцы, земляробстве, жывёлагадоўлі, рамёствах, асновах матэматыкі, батанікі, метэаралогіі, календара, музыкі і інш. Дадзеная вучэбная дысцыпліна з’яўляецца адной з вядучых у сістэме падрыхтоўкі выкладчыкаў па культуралагічных дысцыплінах, паколькі накіравана на актывізацыю і сістэматызацыю ведаў, якія былі набытыя на прадметах псіхолага-педагагічнага і народазнаўчага цыклаў, дазваляе практычна выкарыстаць і ўдасканаліць атрыманыя ўменні і навыкі, садзейнічае развіццю педагагічных, псіхалагічных і арганізатарскіх здольнасцяў магістрантаў.

***Мэта вучэбнай дысцыпліны*** – павышэнне ўзроўню адукацыйнай кампетэнтнасці магістрантаў праз традыцыйныя педагагічныя веды народа.

***Задачы вучэбнай дысцыпліны:***

– пазнаёміць магістрантаў з народнай педагогікай, яе сутнасцю, гісторыяй, мэтамі, дыдактычнымі прынцыпамі;

– засвоіць веды па асноўных накірунках выхавання і навучання ў традыцыйнай педагогіцы;

– сфарміраваць уменні і навыкі ў выкарыстанні разнастайных спосабаў і прыёмаў выхавання і навучання ў народнай педагогіцы;

– сфарміраваць навыкі арганізацыі выхаваўчай і навучальнай работы на аснове народных традыцый.

## Узаемасувязь вучэбнай дысцыпліны з іншымі вучэбнымі дысцыплінамі спецыяльнасці

| Назва вучэбнай дысцыпліны, вывучэнне якой звязана з вучэбнай дысцыплінай “Народная педагогіка” | Пералік актуалізуемых на занятках па вучэбнай дысцыпліне “Народная педагогіка” комплексаў ведаў, якія фарміруюцца на іншых вучэбных |
|---|---|

| | |
|---|---|
| | дысцыплінах |
| Педагогіка і псіхалогія вышэйшай школы | Гісторыя і тэорыя ўзнікнення і развіцця педагогікі і псіхалоіі як навук і вучэбных дысцыплін.<br>Мэты, задачы, дыдактычныя прынцыпы, метады і прыёмы педагогікі, спосабы арганізацыі вучэбнай дзейнасці і разнастайныя педагагічныя тэхналогіі. |
| Асновы інфармацыйных тэхналогій | Практычнае выкарыстанне навучальных мультымедыйных праграм, нотных рэдактараў, праграм тэхнічнай апрацоўкі дадзеных пры засваенні асобных тэм дысцыпліны, выкарыстанне праграмы Microsoft PowerPoint для стварэння мультымедыйных прэзентацый па асобных тэмах дысцыпліны. |
| Каляндар у часе і прасторы: вытокі, сінтэз культур, стылі | Комплекс ведаў і навыкаў, звязаных з вывучэннем розных каляндарных стыляў і традыцый, іх практычнае выкарыстанне. |

**Патрабаванні да засваення вучэбнай дысцыпліны**

Патрабаванні да ўзроўню засваення зместу вучэбнай дысцыпліны “Народная педагогіка” ” (па выбары) вызначаны адукацыйным стандартам па спецыяльнасці для другой ступені вышэйшай адукацыі (магістратуры) 1-08 80 02 – Тэорыя і методыка навучання і выхавання (сусветная і айчынная культура).

Вывучэнне вучэбнай дысцыпліны “Народная педагогіка” ”(па выбары) павінна забяспечыць фарміраванне ў студэнтаў акадэмічных, сацыяльна-асобасных і прафесійных кампетэнцый.

Патрабаванні да акадэмічных кампетэнцый магістра.

Магістр павінны мець:

АК-2. Метадалагічныя веды і даследчыцкія ўменні, якія забяспечваюць вырашэнне задач навукова-даследчай, навукова-педагагічнай, інавацыйна-педагагічнай, вучэбна-метадычнай, арганізацыйна-кіраўнічай, экспертна-ацэначнай дзейнасці.

АК-6. Здольнасць здзяйсняць бесперапынную самаадукацыю і самаўдасканальванне ў навукова-педагагічнай, вучэбна-метадычнай і арганізацыйна-кіраўнічай дзейнасці.

Патрабаванні да прафесійных кампетэнцый магістра.

Магістр павінны быць здольным:

ПК-НД-1. Выкарыстоўваць сучасныя дасягненні педагагічнай навукі і перадавых педагагічных тэхналогій.

ПК-ІП-1. Здзяйсняць педагагічны пошук новаўвядзенняў.

ПК-ІП-2. Ствараць педагагічнае новаўвядзенне.

ПК-ІП-7. Выкарыстоўваць індывідуальныя крэатыўныя здольнасці для арыгінальнага вырашэння даследчых і прафесійных задач у галіне адукацыі.

ПК-ВМ-1. Вырашаць тыпавыя метадычныя задачы.

ПК-ВМ-3. Распрацоўваць метадычныя інструкцыі, вучэбна-метадычныя дапаможнікі, метадычныя рэкамендацыі па актуальных праблемах педагагічнай навукі і практыкі.

ПК-ВМ-4. Распрацоўваць і выкарыстоўваць сучаснае вучэбна-метадычнае забеспячэнне адукацыйнага працэсу.

ПК-ВМ-5. Распрацоўваць метадычныя сцэнары правядзення заняткаў і выхаваўчай работы, аналізаваць вынікі іх рэалізацыі ў адукацыйных установах розных тыпаў.

ПК-АК-1. Арганізоўваць педагагічны працэс ва ўстановах адукацыі розных тыпаў.

ПК-ЭА-4. Распрацоўваць дыягнастычны інструментарый для правядзення экспертызы і ацэнкі, арганізоўваць крытэрыяльную экспертызу і ацэнку разнастайных аспектаў навукова-даследчай і педагагічнай дзейнасці.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны “Народная педагогіка” магістрант павінен

***ведаць:***

– сутнасць, гісторыю, дыдактычныя прынцыпы народнай педагогікі;

– асноўныя накірункі выхавання і навучання ў традыцыйнай педагогіцы;

– мэту і задачы вучэбнай дысцыпліны “Народная педагогіка”;

– сродкі, спосабы і прыёмы выхавання і навучання ў народнай педагогіцы;

– прынцыпы рэалізацыі асноўных накірункаў выхавання і навучання ў традыцыйнай педагагічнай спадчыне;

***умець:***

– знаходзіць у гістарычнай, фальклорна-этнаграфічнай і мастацкай спадчыне традыцыйныя сродкі, спосабы і прыёмы выхавання і навучання, а таксама аналізаваць іх з пункту гледжання сучаснай навукі;

– валодаць методыкай выкарыстання станоўчых традыцыйных сродкаў, спосабаў і прыёмаў выхавання і навучання;

– арганізоўваць выхаваўчую і навучальную работу на аснове народных традыцый;

– валодаць разнастайнымі спосабамі актывізацыі пазнавальнай дзейнасці.

Згодна вучэбнаму плану спецыяльнасці 1-08 80 02 – Тэорыя і методыка навучання і выхавання (сусветная і айчынная культура) вучэбная дысцыпліна “Народная педагогіка” ” (па выбары) вывучаецца на дзённай і завочнай формах атрымання другой ступені вышэйшай адукацыі. Усяго на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны на дзённая форме навучання адводзіцца 82 гадзін, з якіх 36 гадзіны аўдыторных (у тым ліку лекцыйных 30 гадзін, 6 практычных), 46 гадзін прыпадае на самастойную работу студэнтаў. Усяго на вывучэнне

вучэбнай дысцыпліны на завочнай форме навучання адводзіцца 10 гадзін аўдыторных (лекцыйных).

Асноўнымі метадамі (тэхналогіямі) навучання, якія адлюстроўваюць мэту і задачы вучэбнай дысцыпліны, з’яўляюцца: праблемнае навучанне (праблемнае выкладанне матэрыялу, пошукавы і даследчы метады); тэхналогія навучання як вучэбнага даследавання; камунікатыўныя тэхналогіі, заснаваныя на актыўных формах і метадах навучання (разумовы штурм, дыскусія, спрэчка-дыялог, круглы стол і інш.). Сярод форм правядзення семінарскіх заняткаў могуць ужывацца калёквіўмы, тэсты, а таксама традыцыйныя формы кантролю ведаў (вусныя адказы, комплексныя кантрольныя работы, паведамленні і рэфераты).

Самастойная работа студэнтаў прадугледжвае павышэнне ўзроўню прафесійнай кампетэнцыі па асобных пытаннях (аспектах) народнай педагогікі. Асноўнымі формамі самастойнай работы студэнтаў з’яўляюцца: праца з літаратурай, падрыхтоўка дакладаў, рэфератаў па прапанаванай выкладчыкам тэматыцы, прагляд відэаматэрыялаў, наведванне музеяў, выстаў, канцэртаў, праца з Інтэрнэт-рэсурсамі.

Выніковай формай кантролю ведаў з’яўляецца залік у І семестры на дзённай форме навучання і ІІ семестры на завочнай форме навучання.

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

## *Тэма 1.* Народная педагогіка: сутнасць, паходжанне, гісторыя развіцця

Сутнасць паняццяў “народная педагогіка”, “этнапедагогіка”, іх гістарычнае развіццё. Сувязь народнай педагогікі з гісторыяй, культурай, этнаграфіяй, фальклорам, мастацтвам, этыкай, эстэтыкай, народазнаўствам, беларусазнаўствам.

Разгляд розных сістэм народнай педагогікі ў гісторыі культуры. Выпрацоўка ўнутраных арыенціраў паводзін, пошук універсальных маральных прынцыпаў, фарміраванне ўласнай сістэмы каштоўнасцяў у розных культурах і цывілізацыях (паняцце аб вежаствах у казках “Тысяча і адна ноч” і інш.). Фарміраванне матывацыі да навучання ў розных народаў свету.

Станаўленне народнай педагогікі як навукі ў еўрапейскім рэгіёне. Ян Амос Каменскі, Джон Лок, Жан-Жак Русо, Канстанцін Ушынскі і інш. і іх паслядоўнікі на беларускіх землях.

Беларускія гуманісты і этнапедагогі.

Развіццё этнапедагогікі ў наш час.

## *Тэма 2.* Беларуская народная педагогіка

Метадалагічныя асновы вывучэння беларускай народнай педагогікі. Слаі народнай культуры: сялянская, гарадская, шляхецкая, царкоўная. Педагагічныя канцэпцыі.

Этапы фарміравання і развіцця беларускай народнай педагагічнай думкі. Беларусізацыя ў 20-х – пачатку 30- гадоў і ў 90 гадах XX ст.

Узроставы падзел у народнай педагогіцы. Змест сямейнага і пазасямейнага выхавання і навучання.

## *Тэма 3.* Асноўныя сродкі народнай педагогікі

Вусная народная творчасць, праца і родная мова як найбольш старажытныя сродкі народнай педагогікі. Сутнасць і змест асноўных сродкаў. Роля прыказак, прымавак, загадак, казак, паданняў, легендаў, песень, абрадаў, звычаяў, танцаў, гульняў і інш. у народнай педагогіцы і традыцыі. Значэнне іх у навучанні і выхаванні дзяцей.

Традыцыйнае выхаванне як адзін з бакоў духоўнага фарміравання асобы. Выпрацоўка ўнутраных арыенціраў паводзінаў, пошук універсальных маральных прынцыпаў, фарміраванне традыцыйнай сістэмы каштоўнасцяў. Фарміраванне асобы, яе маральных перакананняў і жыццёвай пазіцыі. Традыцыйнае беларускае народнае фарміраванне матывацыі да навучання.

## *Тэма 4.* Формы і метады навучання і выхавання ў народнай педагогіцы

Традыцыйныя дзядзькаванне, дарэктарства, рабінзанада, леснікоўства, пастушаства і інш. як формы народнай педагогікі. Адлюстраванне ў

фальклоры і мастацкай літаратуры цікавых сродкаў і метадаў народнай педагогікі. Традыцыйныя звычаі, спосабы набыцця рамесніцкіх навыкаў, уменняў вядзьмарства, чараўніцтва.

Талака як своеасаблівая з'ява народнага жыцця і спосаб выхавання. Народныя метады выхавання і навучання: праца, гульня, прыклад, аўтарытэт, прывучванне, назіранне, выпрабаванне, ушчуванне, унушэнне, перакананне, практыкаванне, блаславенне, спаборніцтва, пахвала, супрадкі і інш. Іх характарыстыка, адлюстраванне ў прыказках і іншых жанрах народнай творчасці.

### *Тэма 5.* Асноўныя накірункі выхавання і навучання ў народнай педагогіцы

Асноўныя накірункі перадачы традыцыйных ведаў падрастаючаму пакаленню – аб роднай мове і любові да зямлі бацькоўскай, спосабах набыцця працоўных навыкаў і ўменняў, у тым ліку пэўнага рамяства, аб вуснай традыцыйнай спадчыне (літаратуры), аб развіцці разумовых і фізічных здольнасцей, аб традыцыйным побыце і сям'і, маралі і этыкеце, рэлігіі, жывёлаводстве і земляробстве, календары, прыродазнаўстве, асновах матэматыкі, батаніці, медыцыны, метэаралогіі, касмалогіі і інш.

### *Тэма 6.* Працоўнае выхаванне, набыццё навыкаў і ўменняў

Працоўнае выхаванне ва ўсіх сферах жыцця як аснова этнапедагогікі. Вусная народная творчасць аб працы.

Сямейныя традыцыі навучання рамяству. Выкарыстанне метадаў і спосабаў навучання і выхавання. Фарміраванне самастойнасці ў працэсе навучання. Узроўні самастойнай дзейнасці: капіраванне, рэпрадуктыўная дзейнасць, прадуктыўная дзейнасць, самастойная дзейнасць. Тыпы самастойных прац: узнаўляючыя, рэканструктыўна-варыянтныя, творчыя.

### *Тэма 7.* Развіццё разумовых здольнасцей. Першасныя матэматычныя веды

Народныя сродкі ў развіцці лагічнага мыслення, кемлівасці і матэматычных здольнасцей дзяцей. Адносіны народа да кемлівых і здольных, знаўцаў матэматыкі. Роля загадак, лічылак, загадак-задач, казак-загадак і інш.

Фарміраванне прасцейшых ведаў аб прасторы і формах, элементах геаметрыі. Народныя спосабы і меры вымярэння адлегласці, плошчаў, атрымання правільнага круга і прамога вугла.

Значэнне народных ведаў у сучасным адукацыйным працэсе.

### *Тэма 8.* Фізічная культура беларусаў

Асновы фарміравання фізічнай культуры беларусаў. Сінкрэтычная сувязь з паляваннем, абаронай ад ворагаў. Фальклор аб клопаце народа пра здароўе і фізічнае развіццё. Вобразы волатаў і асілкаў як культурных герояў.

Фізічныя спаборніцтвы ў традыцыйным жыцці, абрадах, гульнях. Віды фізічных спаборніцтваў беларускай шляхты (на прыкладзе роду Радзівілаў).

Культура харчавання беларусаў. Значэнне страваванні. Асноўныя прадукты харчавання. Сістэма пастоў.

Роля народных гульняў і іх класіфікацыя. Выкарыстанне забаўлянак з малагодкамі дзеля масажу іх частак цела і развіцця маторыкі рук.

Народная гульня ў сучасных адукацыйным працэсе.

### *Тэма 9.* **Народны этыкет**

Народны этыкет у рэгуляванні ўзаемаадносін людзей у працоўным, грамадскім, бытавым і сямейным жыцці. Адносіны да старэйшага пакалення. Культура паводзін за сталом, на народных святкаваннях, танцах.

Маральныя і эстэтычныя асновы сямейных абрадаў.

Погляды народа ў адлюстраванні нацыянальнага характару, менталітэту. Станоўчыя і адмоўныя рысы беларускага характару. Талерантнасць.

### *Тэма 10.* **Мастацкае і эстэтычнае развіццё**

Актуальнасць традыцыйных форм і метадаў навучання і выхавання ў сучасных педагогіцы, эстэтычнай адукацыі. Гістарычнае развіццё паняцця “прыгожага”. Адлюстраванне эстэтычнага густу народа і яго мастацкіх здольнасцей у фальклорнай спадчыне, адзенні, прадметах побыту, дойлідстве, рамястве.

Сінкрэтычнае эстэтычнае развіццё дзяцей у беларускай традыцыі. Спалучэнне навыкаў рамесніка, мастака, музыканта, танцора, філосафа ў адной асобе. Фалькларысты пра народную музыку, выраб інструментаў. Метады навучання, пераймання мастацкіх традыцый.

### *Тэма 11.* **Арганізацыя выхаваўчай і навучальнай работы на аснове народных традыцый**

Метадычнае значэнне і функцыі выкарыстання станоўчых прынцыпаў народнай педагогікі ў навучальна-выхаваўчым працэсе адукацыйных устаноў. Сістэматычнасць і паступовасць у выкарыстанні форм і метадаў народнай педагогікі. Крытэрыі выбару творчых заданняў для заняткаў. Арганізацыя выхаваўчай і навучальнай работы на аснове народных традыцый.

Выхаванне павагі да іншых народаў, да агульначалавечых каштоўнасцей. Педагагічная мудрасць народа ў працэсе навучання. Традыцыі народнай педагогікі ў пазакласнай і пазашкольнай рабоце. Педагагічныя каштоўнасці народнай педагогікі ў сямейным выхаванні.

## ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

“Народная педагогіка” (па выбары) для дзённай формы атрымання адукацыі

| Нумар раздзела, тэмы, заняткаў | Назва раздзела, тэмы, заняткаў; пералік вывучаемых пытанняў | Колькасць аўдыторных гадзін | | | | | Пазааўдыторная самастойная работа | Матэрыяльнае забеспячэнне заняткаў (нагладныя, метадычныя дапаможнікі і інш.) лекцыі | Формы кантролю ведаў практычныя заняткі |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | лекцыі | практычныя заняткі | семінарскія заняткі | лабараторныя заняткі | ктруемая (кантралюемая) самастойная работа студэнтаў (іншае | | | |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 |
| | **I семестр** | | | | | | | | |
| **1** | **Народная педагогіка: сутнасць, паходжанне, гісторыя развіцця** | **4** | | | | | **5** | | |
| 1.1 | 1. Сутнасць паняццяў “народная педагогіка”, “этнапедагогіка”, іх гістарычнае развіццё.<br>2. Сувязь народнай педагогікі з іншымі навукамі.<br>3. Розныя сістэмы народнай педагогікі ў гісторыі культуры. | 1 | | | | | 2 | 1, 2, 4, 6, 29, 36 | |
| 1.2 | 1. Станаўленне народнай педагогікі як навукі ў еўрапейскім рэгіёне.<br>2. Я.А. Каменскі, Дж. Лок, Ж.-Ж. Русо, К. Ушынскі і інш. | 1 | | | | | 1 | 1, 2, 4, 6, 29, 36 | |
| 1.3 | 1. Беларускія гуманісты і этнапедагогі.<br>2. Развіццё этнапедагогікі ў наш час. | 2 | | | | | 2 | 1, 2, 4, 6, 29, 36 | |
| **2** | **Беларуская народная педагогіка** | **4** | **1** | | | | **4** | | |
| 2.1 | 1. Метадалагічныя асновы вывучэння беларускай народнай педагогікі.<br>2. Віды народнай культуры: сялянская, гарадская, шляхецкая, царкоўная. | 2 | | | | | 2 | 2, 3, 6, 7, 9, 10, 13, 16 | |
| 2.2 | 3. Педагагічныя канцэпцыі. | | 1 | | | | | 2, 3, 6, 7, 9, 10, 13, 16 | Паведамленні |

| | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 2.3 | 1. Этапы фарміравання і развіцця беларускай народнай педагагічнай думкі.<br>2. Беларусізацыя ў 20-х – пачатку 30- гадоў і ў 90 гадах ХХ ст.<br>3. Узроставы падзел у народнай педагогіцы.<br>4. Змест сямейнага і пазасямейнага выхавання і навучання. | 2 | | | | | 2 | 2, 3, 6, 7, 9, 10, 13, 16 | |
| **3** | **Асноўныя сродкі народнай педагогікі** | **2** | | | | | **4** | | |
| 3.1 | 1. Вусная народная творчасць, праца і родная мова як найбольш старажытныя сродкі народнай педагогікі.<br>2. Роля прыказак, прымавак, загадак, казак, паданняў, легендаў, песень, абрадаў, звычаяў, танцаў, гульняў і інш. у народнай педагогіцы. | 1 | | | | | 2 | 2, 3, 6, 7, 9, 10, 13, 16 | |
| 3.2 | 1. Традыцыйнае выхаванне як адзін з бакоў духоўнага фарміравання асобы.<br>2. Выпрацоўка ўнутраных маральных прынцыпаў, фарміраванне традыцыйнай сістэмы каштоўнасцяў.<br>3. Традыцыйнае беларускае народнае фарміраванне матывацыі да навучання. | 1 | | | | | 2 | 2, 3, 6, 7, 9, 10, 13, 16 | |
| **4** | **Формы і метады навучання і выхавання ў народнай педагогіцы** | **2** | **1** | | | | **5** | | |
| 4.1 | 1. Формы народнай педагогікі.<br>2. Адлюстраванне ў фальклоры і мастацкай літаратуры сродкаў і метадаў народнай педагогікі. | 1 | | | | | 2 | 2, 3, 6, 7, 9, 10, 13, 16 | |
| 4.2 | 1. Традыцыйныя звычаі, спосабы набыцця рамесніцкіх навыкаў, іншых уменняў.<br>2. Талака як своеасаблівая з'ява народнага жыцця і спосаб выхавання. | 1 | | | | | 2 | 2, 3, 6, 7, 9, 10, 13, 16 | |
| 4.3 | 1. Народныя метады выхавання і навучання<br>2. Іх характарыстыка, адлюстраванне ў прыказках і іншых жанрах народнай творчасці.. | | 1 | | | | 1 | 2, 3, 6, 7, 9, 10, 13, 16 | Гульня-практыкум |
| **5** | **Асноўныя накірункі выхавання і навучання ў народнай педагогіцы** | **2** | | | | | **2** | | |
| 5.1 | 1. Асноўныя накірункі перадачы традыцыйных | 2 | | | | | 2 | 2, 3, 6, 7, 16, 34 | |

| | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | ведаў.<br>2. Сферы перадачы традыцыйных ведаў. | | | | | | | | |
| **6** | **Працоўнае выхаванне, набыццё навыкаў і ўменняў** | **2** | **1** | | | | **4** | | |
| 6.1 | 1. Працоўнае выхаванне ва ўсіх сферах жыцця як аснова этнапедагогікі.<br>2. Сямейныя традыцыі навучання рамяству. | 2 | | | | | 2 | 2, 26, 32-34 | |
| 6.2 | 1. Узроўні самастойнай дзейнасці.<br>2. Тыпы самастойнай працы. | | 1 | | | | 2 | 2, 26, 32-34 | Майстар-клас |
| **7** | **Развіццё разумовых здольнасцей.<br>Першасныя матэматычныя веды** | **2** | | | | | **4** | | |
| 7.1 | 1. Народныя сродкі ў развіцці лагічнага мыслення, кемлівасці і матэматычных здольнасцей дзяцей.<br>2. Роля загадак, лічылак, загадак-задач, казак-загадак і інш.<br>3. Фарміраванне прасцейшых ведаў аб прасторы і формах, элементах геаметрыі. | 1 | | | | | 2 | 2, 4, 26, 32-34 | |
| 7.2 | 1. Народныя спосабы і меры вымярэння.<br>2. Значэнне народных ведаў у сучасным адукацыйным працэсе. | 1 | | | | | 2 | 2, 4, 26, 32-34 | |
| **8** | **Фізічная культура беларусаў** | **4** | | | | | **5** | | |
| 8.1 | 1. Асновы фарміравання фізічнай культуры беларусаў.<br>2. Сінкрэтычная сувязь з паляваннем, абаронай ад ворагаў.<br>3. Фальклор аб клопаце народа пра здароўе і фізічнае развіццё. Вобразы волатаў і асілкаў як культурных герояў. | 2 | | | | | 1 | 4, 26, 28, 32-34 | |
| 8.2 | 1. Фізічныя спаборніцтвы ў традыцыйным жыцці, абрадах, гульнях.<br>2. Культура харчавання беларусаў. | 1 | | | | | 2 | 2, 4, 26, 28, 32-34 | |
| 8.3 | 1. Роля народных гульняў і іх класіфікацыя.<br>2. Выкарыстанне забаўлянак з малагодкамі дзеля масажу іх частак цела і развіцця маторыкі рук.<br>3. Народная гульня ў сучасных адукацыйным працэсе. | 1 | | | | | 2 | 2, 4, 26, 32-34 | Інтэрактыў-ныя гульні |

| | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **9** | **Народны этыкет** | **2** | **1** | | | | **4** | | |
| 9.1 | 1. Народны этыкет у рэгуляванні ўзаемаадносін людзей у працоўным, грамадскім, бытавым і сямейным жыцці. | 1 | | | | | 2 | 1-2, 4, 22, 26, 32-34 | |
| 9.2 | 2. Культура паводзін за сталом, на народных святкаваннях, танцах. | | 1 | | | | | | Інтэрактыў-ныя гульні |
| 9.3 | 1. Маральныя і эстэтычныя асновы сямейных абрадаў.<br>2. Погляды народа ў адлюстраванні нацыянальнага характару, менталітэту. | 1 | | | | | 2 | 1-2, 4, 22, 26, 32-34 | |
| **10** | **Мастацкае і эстэтычнае развіццё** | **2** | **1** | | | | **5** | | |
| 10.1 | 1. Актуальнасць традыцыйных форм і метадаў навучання і выхавання ў сучасных педагогіцы, эстэтычнай адукацыі.<br>2. Адлюстраванне эстэтычнага густу народа і яго мастацкіх здольнасцей у фальклорнай спадчыне, адзенні, прадметах побыту, дойлідстве, рамястве. | 1 | | | | | 2 | 1-2, 17, 20, 30, 35 | |
| 10.2 | 1. Гістарычнае развіццё паняцця “прыгожага”. Сінкрэтычнае эстэтычнае развіццё дзяцей у беларускай традыцыі.<br>2. Спалучэнне навыкаў рамесніка, мастака, музыканта, танцора, філосафа ў адной асобе. | 1 | | | | | 1 | 1-2, 17, 20, 30, 35 | |
| 10.3 | 1. Метады навучання, пераймання мастацкіх традыцый.<br>2. Фальклarысты пра народную музыку, выраб інструментаў. | | 1 | | | | 2 | 1-2, 17, 20, 30, 35 | Апытанне |
| **11** | **Арганізацыя выхаваўчай і навучальнай работы на аснове народных традыцый** | **4** | **1** | | | | **4** | | |
| 11.1 | 1. Метадычнае значэнне і функцыі выкарыстання прынцыпаў народнай педагогікі ў навучальна-выхаваўчым працэсе адукацыйных устаноў.<br>2. Арганізацыя выхаваўчай і навучальнай работы на аснове народных традыцый. | 2 | | | | | 2 | 1, 4, 5, 8, 19, 24, 27 | |
| 11.2 | 1. Сістэматычнасць і паступовасць у выкарыстанні форм і метадаў народнай педагогікі. | | 1 | | | | | 1, 4, 5, 8, 19, 24, 27 | Паведамленні |

| | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 11.3 | 1. Традыцыі народнай педагогікі ў пазакласнай і пазашкольнай рабоце.<br>2. Педагагічныя каштоўнасці народнай педагогікі ў сямейным выхаванні. | 2 | | | | | 2 | 1, 4, 5, 8, 19, 24, 27 | |
| | **Усяго** | **30** | **6** | | | | **46** | | **Залік** |

## ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

“Народная педагогіка” (па выбары) для завочнай формы атрымання адукацыі

| Нумар раздзела, тэмы, занятка | Назва раздзела, тэмы, занятка; пералік вывучаемых пытанняў | Колькасць аўдыторных гадзін | | | | | Пазааўдыторная самастойная работа | Метадычнае забеспячэнне заняткаў (наглядныя, метадычныя дапаможнікі і інш.) лекцыі | Формы кантролю ведаў практычныя заняткі |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | лекцыі | практычныя заняткі | семінарскія заняткі | лабараторныя заняткі | кіруемая (кантралюемая) самастойная работа студэнтаў | | | |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 |
| **І год навучання 1 семестр** | | | | | | | | | |
| 1 | Народная педагогіка: сутнасць, паходжанне, гісторыя развіцця | 1 | | | | | | 1, 2, 4, 6, 29, 36 | |
| 2 | Асноўныя сродкі народнай педагогікі | 1 | | | | | | 2, 3, 6, 7, 16, 34 | |
| 4 | Формы і метады навучання і выхавання ў народнай педагогіцы | 1 | | | | | | 2, 3, 6, 7, 9, 10, 13, 16 | |
| 5 | Асноўныя накірункі выхавання і навучання ў народнай педагогіцы | 1 | | | | | | 3, 7, 9, 10, 13, 16 | |
| | **Усяго** | **4** | | | | | | | |
| **І год навучання 2 семестр** | | | | | | | | | |
| 8 | Народны этыкет | 1 | | | | | | 1-2, 4, 22, 26, 32-34 | |
| 10 | Арганізацыя выхаваўчай і навучальнай работы на аснове народных традыцый | 1 | | | | | | 1, 4, 5, 8, 19, 24, 27 | |
| | **Усяго** | **2** | | | | | | | **Залік** |
| | **Усяго** | **6** | | | | | | | |

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## ЛІТАРАТУРА


**Асноўная:**

1. Болбас, В. С. Этнічная педагогіка беларусаў : дапаможнік для студэнтаў устаноў вышэйшай адукацыі, якія навучаюцца па спецыяльнасцях профілю А – Педагогіка / В. С. Болбас ; Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, Установа адукацыі "Мазырскі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя І. П. Шамякіна". – Мазыр : МДПУ імя І. П. Шамякіна, 2013. – 110 с.
2. Болбас, В. С. Базавыя прынцыпы маральнага выхавання ў этыка-педагагічнай думцы Беларусі X–XVIII стагоддзяў / В. С. Болбас // Педагогическая наука и образование. – 2015. – № 1. – С. 39–46.
3. Лозка, А. Ю. Беларуская фалькларыстыка: Народная педагогіка і дзіцячы фальклор: вучэб.-метад. дапам. / А. Ю. Лозка, К. Л. Баброўская. – Мінск : БДПУ, 2012. – 124 с.

**Дадатковая:**

4. Арлова, Г. П. Народная педагогіка як сродак выхавання вучняў : дапам. для педагогаў агульнадукац. устаноў і ўстаноў пазашк. выхавання і навучання / Г. П. Арлова. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2009. – 144 с.
5. Аляхновіч, А. М. Народная песня ў школе : дапам. для настаўнікаў музыкі і спеваў, кл. кіраўнікоў, выхавальнікаў / А. М. Аляхновіч. – Мінск : Беларусь, 2004. – 171 с.
6. Антология педагогической мысли Белорусской ССР / сост. Э.К. Дорошевич, М.С. Мятельский, П.С. Солнцев. – М. : Педагогика, 1986. – 468 с.
7. Арлова, Г. П. Беларуская народная педагогіка / Г. П. Арлова. – Мінск : Народная асвета, 1993. – 120 с.
8. Арлова, Г. П. Народная педагогіка ў выхаваўчай рабоце школы / Г. П. Арлова. – Мінск : ГВЗАТ "Маладняк", 1995. – 160 с.
9. Асвета і педагагічная думка ў Беларусі: са старажытных часоў да 1917 г. / М. А. Ткачоў, У. С. Пасэ, Г. Р. Сянькевіч [і інш.]. – Мінск : Нар. асвета, 1985. – 464 с.
10. Беларусазнаўства : навуч. дапам. БДУ / пад рэд. П. Брыгадзіна. – Мінск : Завігар, 1997. – 288 с.
11. Беларуская народная педагогіка ў сістэме дашкольнага выхавання: вучэб-метад. дапам. / А. А. Грымаць. – Мінск : БДПУ, 1994. – 209 с.
12. Беларускі дзіцячы фальклор : традыц. запісы, апрацоўкі і аўт. творы / скл. А. М. Аляхновіч, М. В. Рахчэеў, А. С. Фядосік, У. Д. Каструлёў. – Мінск : Беларусь, 1994. – 271 с.
13. Беларускі фальклор у школе : 1-шы клас ; дапам. для настаўніка / І. І. Сучкоў [і інш.]. – Мінск : Нар. асвета, 1996. – 176 с.
14. Беларускі фальклор у школе: 2-гі клас; дапам. для настаўніка / аўт.-уклад. : І. І. Сучкоў [і інш.]. – Мінск : Беларусь, 2000. – 174 с.
15. Беларускі фальклор : Хрэстаматыя. 4-е выд. – Мінск, 1996.

16. Богданович, А.Е. Педагогические воззрения белорусского народа / А.Е. Богданович // Минский листок. – 1886. – 18 нояб.; 5 дек.

17. Болбас, В. С. Эстэтычная педагогіка беларусаў / В. С. Болбас, І. С. Сычова. – Мазыр : Белы Вецер, 2011. – 197 с.

18. Веснавыя святы: Дапам. для наст. і выхав. / аўт.-уклад. А. Аляхновіч, А. Лозка. – Мінск : Беларусь, 2000. – 158 с.

19. Восеньскія святы: дапам. для настаўн. і выхав. / уклад. А. Ю. Лозка. – Мінск : Беларусь, 1995. – 110 с.

20. Грымаць, А. А. Беларуская народная педагогіка ў школе / А. А. Грымаць, Л. М. Варанецкая. – Мінск : БДПУ імя М. Танка, 1996. – 174 с.

21. Грымаць, А. А. Народная педагогіка беларусаў / А. А. Грымаць, Л. М. Варанецкая, У. В. Пашкевіч. – Мінск : Выд. Ул. М. Скакун, 1999. – 241 с.

22. Дзіцячы фальклор / скл. Г. А. Барташэвіч. – Мінск : Навука і тэхніка, 1972. – 736 с.

23. Дзіцячы фальклор : зборнік фальклорных матэрыялаў / нав. рэд. У. А. Васілевіч. – Мінск : БДПУ, 2006. – 359 с.

24. Зімовыя святы. Дапам. для наст. і выхав. / аўт.-уклад. А. Аляхновіч, А. Лозка. – Мінск : Беларусь, 1999. – 159 с.

25. Загадкі / склад. М. Я. Грынблат, А. І. Гурскі. – Мінск : Беларуская навука, 2004. – 363 с.

26. Калачова, І. І. Народныя традыцыі і звычаі выхавання. Этнапедагагічная спадчына народаў Беларусі / І. І. Калачова. – Мінск : НІА, 1999. – 179 с.

27. Летнія святы: дапам. для наст. і выхав. / аўт.-уклад. А. Лозка. – Мінск : Беларусь 2001. – 162 с.

28. Лозка, А. Ю. Беларуская фалькларыстыка: Народныя гульні : вучэб.-метад. дапам. / А. Ю. Лозка, А. В. Дрыгін. – Мінск : БДПУ, 2012. – 176 с.

29. Народная педагогіка беларусаў / У. М. Конан [і інш.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 1996. – 165 с.

30. Народная спадчына – дашкольнікам: дапам. для выхавальн. дашк. установ / пад рэд. А. Лозкі. – Мінск : НМЦэнтр, 1998. – 152 с.

31. Никифоровский, Н. Я. Очерки Витебской Белоруссии // Этнографическое обозрение: I. Старцы, № 1, 1892; II. Дударь и Музыка, № 2-3, 1892; III. Пособники жихара, № 2, 1893; IV. Подданые пособники, № 1, 1894; V. Питущие и пропойцы, № 4, 1896; VI. Игры и игроки, № 3, 1897; VII. Бабы, або жонки, № 2,1898; VIII. Сбяги, прочки, вонки, уходалы, № 1-2, 1899.

32. Прыказкі і прымаўкі: у дзвюх кн. Кн. 1 / склад. М. Я. Грынблат. – Мінск : Навука і тэхніка, 1976. – 560 с.

33. Прыказкі і прымаўкі: у дзвюх кн. Кн. 2 / склад. М.Я. Грынблат. – Мінск : Навука і тэхніка, 1976. – 616 с.

34. Ракава, Л. В. Традыцыі сямейнага выхавання ў беларускай вёсцы / Л. В. Ракава. – Мінск : Ураджай, 2000. – 111 с.

35. Салееў, В. А. Этнапедагогіка і эстэтычнае развіццё асобы / В. А. Салееў. – Мінск : НІА, 1994. – 181 с.

36. Теория культуры / под ред. С. Н. Иконниковой, В. П. Большакова. – СПб. : Питер, 2008. – 592 с.

37. Хрестоматия по культурологии: учеб. пособие. – Ростов н/Д.: Феникс, 2004. – 624 с.

38. Человек и культура: Индивидуальность в истории культуры / Отв. ред. А. Гуревич. – М., 1990. – 203 с.

# МЕТАДЫЧНЫЯ РЭКАМЕНДАЦЫІ ПА АРГАНІЗАЦЫІ САМАСТОЙНАЙ РАБОТЫ СТУДЭНТАЎ

Самастойная работа студэнтаў па засваенні вучэбнай дысцыпліны “Народная педагогіка” (па выбары) складаецца з шэрагу відаў дзейнасці:

1. Азнаямленне са схематычнымі малюнкамі, табліцамі па гісторыі культуры. Стварэнне схем, табліц.
2. Праца з педагагічнай і мастацтвазнаўчай літаратурай, матэрыяламі архіваў. Праца з Інтэрнэт-рэсурсамі.
3. Падрыхтоўка дакладаў, рэфератаў па прапанаванай выкладчыкам тэматыцы.
4. Прагляд відэазапісаў правядзення заняткаў з выкарыстаннем элементаў народнай педагогікі.
5. Наведванне музеяў (Нацыянальнага мастацкага музея, Музея старажытнабеларускай культуры, калекцыі лялек кафедры мастацкай адукацыі і музея кафедры тэорыі і методыкі выкладання мастацтва факультэта эстэтычнага выхавання і інш.).
6. Наведванне заняткаў фальклорна-этнаграфічных гурткоў, клубаў, выстаў; спектакляў, канцэртаў, харэаграфічных і тэатральных пастановак.
7. Распрацоўка фрагментаў заняткаў і пазакласных мерапрыемстваў з выкарыстаннем элементаў народнай педагогікі.

# ПЕРАЛІК СРОДКАЎ ДЫЯГНОСТЫКІ ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

Для дыягностыкі сфарміраванасці кампетэнцый студэнтаў па вучэбнай дысцыпліне “Народная педагогіка” (па выбары) рэкамендуецца выкарыстоўваць наступныя сродкі:

• паведамленні;
• інтэрактыўныя гульні;
• апытанне;
• майстар-клас;
• гульня-практыкум;
• залік.

Выніковай формай кантролю ведаў і ўменняў студэнтаў па вучэбнай дысцыпліне з’яўляецца залік, які праводзіцца ў вуснай форме.

## ПРАТАКОЛ УЗГАДНЕННЯ ВУЧЭБНАЙ ПРАГРАМЫ УВА

| Назва дысцыпліны, з якой патрабуецца ўзгадненне | Назва кафедры | Прапановы аб зменах у змесце вучэбнай праграмы ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне | Рашэнне, прынятае кафедрай, якая распрацавала праграму (з указаннем даты і нумара пратакола) |
|---|---|---|---|
| Каляндар у часе і прасторы: вытокі, сінтэз культур, стылі (па выбары) | Кафеда тэорыі і методыкі выкладання мастацтва | Прапаноў аб зменах няма | Пратакол № 10 ад 12.05.2017 г. |

ДОПОЛНЕНИЯ И ИЗМЕНЕНИЯ К УЧЕБНОЙ ПРОГРАММЕ
УЧЕБНОЙ ДИСЦИПЛИНЫ «Народная педагогика»
(специальность 1-08 80 02 Теория и методика обучения и воспитания
(мировая художественная культура))
на 2019/2020 учебный год

| №№ пп | Дополнения и изменения | Основание |
|---|---|---|
| 1 | Заменить список основной литературы следующими источниками:<br>1. Полякова, Е. С. Методологические основания развития личности педагога-музыканта в образовательном процессе / Е. С. Полякова. – Минск : ИВЦ Минфина, 2019. – 235 с.<br>2. Глазырина, Л. Д. Музыкально-педагогический словарь / Л. Д. Глазырина, Е. С. Полякова. – Минск : Беларуская навука, 2017. – 363 с. | 1. Обновление списка основной литература в связи с истечением срока действия грифованых учебных пособий. |

Учебная программа пересмотрена и одобрена на заседании кафедры теории и методики преподавания искусства (протокол № 6 от 27.01.2020)

Заведующий кафедрой
теории и методики преподавания искусства
доктор искусствоведения, доцент _________ Ю.Ю.Захарина

УТВЕРЖДАЮ
Декан факультета эстетического образования
кандидат пед. наук, доцент _________ И.И.Рыжикова

Методист отдела магистратуры _________ О.А.Сергушкина